Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-01-17

Настаўніцкая газета
17 студзеня 2013 года

# Эксперт: "Кітаяфобія не мае пад сабой грунту"

**Заўтра ў Беларускім дзяржаўным універсітэце адкрыецца І Беларуска-кітайскі семінар па прамысловым і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве. Адметна, што яго арганізатарам выступіў Рэспубліканскі інстытут кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ, а пляцоўку прадаставіць Белдзяржуніверсітэт.**

На экспертным круглым стале, што прайшоў напярэдадні семінара, шмат было сказана аб тым, чаму нашай краіне выгадна супрацоўнічаць з Кітаем. Эксперт у галіне адносін з КНР загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Сяргей Кізіма прывёў такія факты: ў 2009 годзе Кітай выдзеліў на навукова-даследчыя работы 12% сусветных выдаткаў у гэтай сферы (Японія, для параўнання, — 11%). І гэта на фоне няўхіснага скарачэння долі выдаткаў Еўрасаюза і ЗША (у 2009 годзе аб'ядная Еўропа выдаткоўвала на навуку 23% сусветных затрат, а ЗША — 31%).

Іншыя тэндэнцыі таксама даюць падставы рабіць станоўчыя прагнозы наконт будучыні КНР. Напрыклад, у краіне працуе каля 700 мільёнаў чалавек. Уражваюць тэмпы развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі: будуюцца сотні новых універсітэтаў. Акрамя таго, Кітай навучае за мяжой больш сваіх студэнтаў, чым любая іншая краіна. Бурна развіваецца прамысловасць, расце экспарт. Эксперты прадказваюць: да 2030 года эканоміка КНР будзе складаць трэць сусветнай.

— У Кітая вялікая колькасць пачынанняў, якія нам надзвычай цікавыя, — адзначыў С.А.Кізіма. — Чаго варты толькі той факт, што на працягу 10—15 гадоў КНР стане краінай з самымі вялікімі ўкладаннямі ў навукова-канструктарскія работы. Значыць, яна сапраўды будзе здольная прынесці на тэрыторыю Беларусі самыя сучасныя тэхналогіі.

Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя прафесар Аляксандр Гардзей паказаў развіццё эканамічнага супрацоўніцтва дзвюх краін у лічбах. У 2002 годзе тавараабарот паміж Беларуссю і Кітаем складаў 34 мільёны долараў ЗША, а ў 2010 — ужо 2,5 мільярда. На кастрычнік 2012 года заключаны кантракты ў галіне энергетыкі, камунікацый, хімічнай прамысловасці, інфраструктуры на суму больш за 16 мільярдаў долараў ЗША. За апошні час нашы краіны рэалізавалі 15 праектаў на нацыянальным узроўні і каля 30 — на галіновым.

Праект, які ва ўсіх на вуснах, — Беларуска-кітайскі індустрыяльны парк, які прыцягне інвестыцый на суму 2 мільярды долараў (па некаторых ацэнках, да 5,5 мільярда). А праз 20 гадоў на тэрыторыі гэтай зоны, як прагназуюць спецыялісты, будзе сканцэнтравана каля 40—50 мільярдаў долараў замежных інвестыцый. Па словах С.А.Кізімы, Беларусі на тэрыторыі парка цікавыя праекты ў галіне машынабудавання, тонкай хіміі, біятэхналогіі, электронікі, новых матэрыялаў. Прыярытэт будзе аддавацца вытворчасці прадукцыі з высокім экспартным патэнцыялам. Карысны для нашай краіны і ўласна вопыт па нарошчванні экспарту, што дэманструе Кітай, як найбуйнейшы экспарцёр свету.

Прадпрыемствы індустрыяльнага парка прадаставяць працоўныя месцы беларускім інжынерам і канструктарам. Як сцвярджае эксперт, кітайцы аддаюць перавагу нашаму персаналу, таму страхі наконт іміграцыі кітайскай рабочай сілы беспадстаўныя.

— Кітаяфобія не мае пад сабой грунту, — упэўнены загадчык кафедры.

Плануецца, што ў І Беларуска-кітайскім семінары па прамысловым і навукова-тэхнічным супрацоўніцтве возьмуць удзел прадстаўнікі Пасольства КНР, Міністэрства замежных спраў Беларусі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях, Нацыянальнай акадэміі навук, навукова-тэхналагічнага парка БНТУ "Палітэхнік", сумесных беларуска-кітайскіх прадпрыемстваў, кітайскіх інвестыцыйных кампаній, беларускіх універсітэтаў, даследчыкі, якія вывучаюць пытанні беларуска-кітайскага супрацоўніцтва.

Адна з мэт мерапрыемства, якое, як кажуць, наспела ў сувязі з інтэнсіфікацыяй супрацоўніцтва дзвюх краін, — падвядзенне вынікаў дваццацігадовага ўзаемадзеяння.

Семінар праводзіцца пры падтрымцы аналітычнага цэнтра EcooM, кампаніі "Бел Хуавэй Тэхналаджыс", Пасольства КНР у Беларусі.

**Аляксандр АНДРЫЯНАЎ.**

Аляксандр Андрыянаў. Эксперт:
«Кітаяфобія не мае пад сабой грунту»